**УДК 39**

# 1941 ГОД ВАЧЫМА ДЗЯЦЕЙ І ПАДЛЕТКАЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ: АНТРАПАЛАГІЧНЫ ДЫСКУРС ВАЕННАЙ ГІСТОРЫІ[1]

***д-р гіст. навук У.А. ЛОБАЧ***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разглядаюцца асаблівасці дзіцячага ўспрыняцця пачатковага этапа Вялікай Айчыннай вайны і нацысцкай акупацыі Беларусі ў 1941 г. Вызначаны вузлавыя моманты дзіцячых успамінаў пра пачатак вайны (адступленне Чырвонай Арміі, з'яўленне салдат вермахта, лёс савецкіх ваеннапалонных). Ахарактарызавана спецыфіка ўспрыняцця і інтэрпрэтацыі гістарычных падзей у рамках лакальных вясковых супольнасцей Паўночнай Беларусі.*

***Ключавыя словы**: дзеці, 1941 год, Віцебшчына, вусная гісторыя, Вялікая Айчынная вайна.*

**Уводзіны**. Праблематыка Вялікай Айчыннай вайны мае быць надзвычай актуальнай для айчыннай гістарыяграфіі і ўяўляе сабой поле негалоснага канфлікту розных падыходаў, метадалогій і канцэпцый. Але пры гэтым галасы "дзяцей вайны" застаюцца ў большасці сваёй непачутымі прафесійнымі гісторыкамі. Гэта ў поўнай ступені датычыцца і 1941 года – трагічнай старонкі беларускай гісторыі, калі з мірнага жыцця краіна трапіла ў цянёты нацысцкай акупацыі.

Нават беглы агляд навуковых даследаванняў, прысвечаных падзеям ІІ Сусветнай вайны на Беларусі, паказвае, што сярод прыярытэтных крыніц практычна адсутнічаюць наратывы тых, хто перажыў вайну і быў сведкам усіх трагічных акалічнасцей, што разгортваліся на тутэйшых абшарах. Між тым, "вусныя крыніцы дазваляюць зафіксаваць унікальную інфармацыю, што не перадаецца іншым шляхам. Калі пісьмовыя крыніцы афіцыйнага паходжання часцей за ўсё адлюстроўваюць гісторыю дзяржавы і яе інстытутаў, то вусныя крыніцы звяртаюцца да гісторыі і паўсядзённага жыцця народа, прытым дазваляюць зрабіць гэта вачыма сведкаў былых падзей. Тым самым гісторыі вяртаецца чалавечае вымярэнне. Таму перспектывы развіцця вуснай гісторыі вызначаюцца не яе процістаяннем з традыцыйнай гістарыяграфіяй, а насупраць – іх цесным супрацоўніцтвам і ўзаемадзеяннем пры захаванні адноснай самастойнасці" [1, с. 281].

Нават пры ўсведамленні знакавасці і значнасці вусных крыніц, якія пераводзяць даследванне ў іншую, адрозную ад класічнай гісторыі, плашчыню, праблема выкарыстання ўспамінаў яшчэ жывых сведкаў ваенных падзей палягае ў тым, што вымагае ад даследчыка досведу палявога этнографа (антраполага), а не толькі архівіста, як гэта ёсць у гісторыкаў. Так, вядомы даследчык Беларусі часоў нацысцкай акупацыі Бернард К'яры пазначае: "Зразумець вайну "маленькіх людзей" – гэта я і цяпер лічу надзённай задачай" [2, с. 7]. Але намеры аўтара застаюцца простай дэкларацыяй, бо ў выдатнай паводле канцэптуальнасці і фактalогіі манаграфіі галасоў "маленькіх людзей" не чуваць. Беларуская акадэмічная супольнасць, на вялікі жаль, нават і не ставіць такіх намераў. У той жа час, зварот да "вуснай гісторыі" пры даследаванні падзей апошняй вайны сутыкаецца з вельмі істотнай праблемай: "Людзей, якія перажылі вайну, сёння засталося не больш 6–7%, гэта галоўным чынам пажылыя і малаадукаваныя жанчыны, у якіх у масе сваёй няма ні сродкаў, ні магчымасцяў, а галоўнае – няма матываў, імкнення да перадачы падобнага вопыту" [3, с. 88]. Факт фізічнага сыходу ваеннага пакалення і недасяжнасць іх сведчанняў у бліжэйшай перспектыве канстатуе і нямецкі даследчык Б. Мусял: "Нарэшце, варта назваць адзін від крыніц, што праз некалькі гадоў больш не зможа быць выкарыстаны, але які ў дадзенай працы адыгрывае важную ролю. Гаворка тут ідзе пра інтэрв'ю і апытанні былых партызанаў…, беларускіх, польскіх, рускіх і яўрэйскіх сведак, а таксама былых нямецкіх салдат" [4, с. 17].

Нежаданне беларускіх гісторыкаў выйсці з "зоны камфорту" (архіваў ды кабінетаў) у "поле" пераводзіць навуковую праблематыку ў маральна-этычную праблему. Няўжо, калі чалавек не належыць да катэгорыі "герояў" ці "ахвяр", а пакутліва перажываў чарговую "блакаду" карнікаў у расонскіх лясах ці пінскіх балотах, яго памяць пра гады акупацыі ня вартая ўвагі? Падыход, калі суб'ектамі гісторыі выступаюць адно канфліктуючыя бакі (акупанты і партызаны), прыводзіць да таго, што пераважная частка насельніцтва акупаванай Беларусі застаецца на старонках даследаванняў вымушаным аб'ектам гвалту і ўціску, "маўклівай большасцю", чый голас, візія, усведамленне і інтэрпрэтацыя драматычных падзей гісторыі краіны ў разлік не прымаюцца ці пераказваюцца ўскосна, з рэляцый акупацыйных улад ці камандзіраў партызанскіх аддзелаў.

[1] Артыкул падрыхтаваны ў рамках праекта БРФФД-РФФД "Субкультура детства в дискурсе устной истории, языке и фольклоре Витебско-Псковского пограничья ХХ – начала ХХI века", дамова № Г20Р-095.

Трэба адзначыць, што “вусная гісторыя”, як апеляцыя інтэлектуалаў з ліку даследчыкаў да непасрэдных сведкаў падзей, мела месца яшчэ ў савецкі перыяд, яскравым прыкладам чаго ёсць дакументальная аповесць “Я з вогненнай вёскі…”, дзе змешчаны ўспаміны цудам ацалелых жыхароў 147 беларускіх вёсак, знішчаных карнікамі ў час акупацыі [5, с. 6]. Досыць знакавай выступае тая акалічнасць, што пошукам сведкаў і дакументальнай фіксацыяй успамінаў займаліся не прафесійныя гісторыкі, а беларускія пісьменнікі – А. Адамовіч, Я. Брыль, У. Калеснік, што асабіста прымалі ўдзел у партызанскім супраціве на тэрыторыі Беларусі. З аднаго боку, выданне эмацыйна і праўдзіва гаворыць “ад першай асобы” злачынную сутнасць нацысцкага рэжыму на тэрыторыі Беларусі, але ў той жа час выразна пазначыла, што лёс і “малая гісторыя” дзясяткаў тысяч беларускіх вёсак, што перажылі жудасць акупацыі, не ўпісваюцца ў афіцыйную савецкую дактрыну Вялікай Айчыннай вайны.

У наш час выдатны ва ўсіх адносінах беларуска-германскі праект “Детство войны 1941−1945: живые свидетельства Беларуси”, прысвечаны трагічнаму лёсу беларускіх дзяцей, што трапілі ў канцлагеры ці на прымусовыя працы [6], адначасова засведчыў, што жыццёвы досвед тых “дзяцей вайны”, хто не быў ахвяраю, па-за ўвагаю як навукоўцаў, так і грамадскіх арганізацый.

Жыццё дзяцей ў час вайны і акупацыі мае сваю спецыфіку, паколькі “вайна сваім уварваннем у свет дзяцей выклікае парушэнне яго межаў, стэрэатыпаў паводзінаў, што ўключаюць асаблівыя стратэгіі і практыкі выжывання, трансфармацыі штодзённага побыту” [7, с.18]. Дзіця ці падлетак, асабліва ў вясковай, традыцыйнай па сутнасці, супольнасці аўтаматычна наследуе сістэму жыццёвых каштоўнасцей і поглядаў на свет – базавых для сям’і і вёскі ў цэлым. Разам з тым, дзіцячы погляд на свет больш непасрэдны, наіўны, у пэўным сэнсе фальклорны, не абцяжараны ідэалагічнымі ўсталяваннямі, калі ўвагу могуць прыцягваць рэчы ці з’явы, неістотныя для дарослых. З другога боку, дзіцячая памяць фіксуе рэальныя падзеі, у аднолькавай ступені важныя як для сям’і, так і для вясковай грамады і краіны. Як пазначае Н.А. Фурсіна, “у дзіцячых успамінах прысутнічае і выразна выяўленае разуменне гістарычнай значнасці найбольш важных, з гледзішча саміх рэспандэнтаў, падзей ваеннага часу, сведкамі якіх яны апынуліся” [1, с. 282]. Успаміны пра перыяд акупацыі ёсць выбарачныя і фрагментарныя, могуць карэляваца пасляваенным жыццёвым досведам, калі чалавек робіць высновы ці выяўляе прычынна-выніковую сувязь тых ці іншых падзей. “Дзеці вайны” часам апелююць да пасляваеннага погляду на падзеі і дадаюць у апавяданне ідэалагічныя штампы, каб выглядаць паводле іх меркавання, больш пераканаўчымі ў вачах інтэрвьюера” [8, с. 81]. Аднак, высновы рэспандэнта могуць мець самастойны, альтэрнатыўны афіцыйнаму дыскурсу, характар. Прыкладам можа быць тлумачэнне жыхаркай Лёзненшчыны лютасці фінскіх карнікаў падчас акупацыі. “[Ці сільна злыя немцы былі?] *Не. Немцы, не, а былі эты, дзе нашы ваявалі.* [Фіны, можа?] *Фіны. Бо этыя былі ў карацельных атрадах усюдых. Этыя былі на нас злыя, яны нам мсцілі. Нашы салдаты тожа натварылі з іхнымі дзевушкамі, насілавалі іх, і яны мсцілі нам. Фіны.* [Фіны злейшыя за немцаў?] *Ой, эта быў белы народ, здаровы. Ну, і мсцілі, вот этыя мсцілі. А немцы, не, немцы, не*”[2]. Але ў большасці выпадкаў, успаміны пра вайну – гэта “эмацыйнае апавяданне пра адну ці некалькі найбольш яркіх падзей, якія неадрэфліксавана заселі ў памяці апавядальніка на доўгія гады” [8, с. 81].

Прадметам даследавання выступае ўласна змест успамінаў пра 1941 год пры магчымых суадносінах з дакументальнай гісторыяй. Опцыя 1941 года была выбрана невыпадкова, бо пачатак вайны азначаў радыкальны перелом жыццёвага парадку, пасля якога свет ужо не меў магчымасці вярнуць свой ранейшы стан. Вайна, з імклівым наступленнем частак вермахта, развалам савецкай дзяржаўнай сістэмы на тэрыторыі Беларусі, мабілізацыяй мужчынскага насельніцтва ў шэрагі Чырвонай арміі, інфармацыйным вакуумам, жорсткімі баямі і першымі масавымі ахвярамі, сталася татальнай дэструкцыяй існага жыццёвага ладу на ўсіх яго таксанамічным узроўнях: сям’я – грамада – краіна. “Масавыя адносіны да вайны практычна не адрозніваюцца ад успрыняцця яе як традыцыйна стыхійных бедстваў – голаду, паморку, патопаў ці землятрусаў, прычыны якіх малазразумелыя, а наступствы – жахлівыя” [3, с. 87]. У семіятычнай праекцыі вайну можна параўнаць са “смерцю” старога светаладу ў рытуальных каляндарных практыках, калі знікаюць межы паміж сваім і чужым, а прадстаўнікі іншага свету аказваюцца сярод людзей. Толькі ў выпадку з вайной размова ідзе не пра міфалагічныя іпастасі “чужынцаў” і сімвалічную дэструкцыю светаладу, але пра абсалютна рэальную варожую нямецкую армію, якая несла гвалт, смерць і разбурэнні.

Асноўнымі крыніцамі пры напісанні артыкула сталі запісы ўспамінаў, зробленыя супрацоўнікамі Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта практычна на ўсёй тэрыторыі Віцебскай вобласці ў перыяд 2009 – 2019 гг. Даволі сутнасныя адрозненні ва ўспрыняцці падзей 1941 г., якія выяўляюцца ва ўспамінах, абумоўлены значнай культурнай і ментальнай розніцай паміж заходняй і ўсходняй часткамі рэгіёна. Для Заходняй Беларусі ў цэлым, якая да 1939 г. была ў складзе Польскай дзяржавы, савецкая ўлада да пачатку Вялікай Айчыннай вайны “так і не стала “сваёй” [9, с. 17], што, у сваю чаргу, абумовіла рознае ўспрыняцце драматычных падзей 1941 г.

---

[2] Фальклорны архіў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (ФА ПДУ): Зап. У. Лобач у 2015 г. ад Лаўніховіч Марыі Сямёнаўны, 1924 г.н. у в. Бабінавічы Лёзненскага р-на.

**Першыя дні вайны**. Калі для дарослых вайна была неспадзяванай і па вызначэнні страшнай з'явай, то ў дзяцей яна не выклікала ніякіх асацыяцый, паколькі ўцямныя ўяўленні пра вайну адсутнічалі ў дзіцячай карціне свету. Адсюль невыпадкова, што дзяўчынка ўспрымае артылерыйскую кананаду за грымоты пяруна: "*А немцы прышлі ж летам. Грыміць і грыміць гром. І сонца, неба яснае, а гром грыміць. Пытаюся я ў мамы, кажу, чаго там гром грыміць? Гаворыць: "Дачушка, гэта ня гром – вайна". Мы ж не прадстаўлялі, што такое вайна*" (Мёрскі р-н)[3]. У дзіцячай свядомасці вайна набліжана да прыродных катаклізмаў, знакам чаго выступае само сонца. І толькі пасля нябеснага знака па радыё гучыць афіцыйнае паведамленне: "*Праснуліся у дзярэўні. Тагда было такое радіо, знаеце, дзе-та вісело.* [Талерка?] *Ага, талерка, тагда там перадавалі калхозныя дзяла.* ***А то ўдруг солнце не взашло***. *Закрычала гэта радіо, людзі высапаліся на уліцу, сказалі па радіву: Вайна, пачалася вайна. Гітлераўцы вераломна напалі на Савецкі Саюз. Было аб'яўлено. Ну усё, началась суматоха ў дзярэўні*" (Бешанковіцкі р-н)[4]. Сюжэт, калі неба (сонца, месяц) дае прарочыя знакі на зямныя (асабліва трагічныя) падзеі, – глыбока міфалагічны і ўказвае на адпаведныя ўласцівасці не толькі дзіцячай ментальнасці, але і традыцыйнай карціны свету беларускага вяскоўца першай паловы XX ст.: "*На Вялікадня былі мы ў Дольцах, на Усеночнай. Вот яно* [сонца] *іграла. Колькі людзей было, столькі выйшла з цэркві, усе глядзелі як на дзіва. Дзіва ж было. Неба было цёмнае, як туча, і краснае, як кроў. Было неба гэткае каля сонца. А сонца разбяжыцца на чатыры частачкі абакнавенна, на чатыры частачцы накрыж, і апяць збяжыцца ўместа. І во гэтак з час можа глядзелі, дужа доўга стаялі. Тады гэдак казалі, што перад вайной. І, мусіць, у той год ці вайна і не началася*" (Ушацкі р-н)[5]

Неўсведамленне сутнасці вайны і яе смяротнай небяспекі выразна адлюстраваныя ва ўспамінах, калі дзясяцігадовая дзяўчынка пільнуе свінняў, не зважаючы на выбухі нямецкіх авіябомб: "*Во тады я помню і вайну, як я ўцікала са свіннямі етымі. Бамбяць самалёты нямецкія, во кала самай агародаў кала найшых..., бамбяць рядам. Тут бамбяць, тут я са свіннямі бегаю. А салдаты хуваюцца пад амбар і крічаць на меня: "Дзевачка, дурачка, кідай етых свінней ды залазь скарей пад амбар, ты ж відзіш, як асколкі еты ляцяць". А во, відзіш, не судзьба была пагібнуць, каля самых агародаў бомбы рвались*" (Лёзненскі р-н)[6].

Ва ўсходняй частцы Віцебшчыны вельмі часта ўзгадваюць пра мабілізацыю мужчын на фронт і адпаведны псіхаэмацыйны настрой у вясковай грамадзе: "*Ну, вот я помню, як началася (вайна). Ну, праснуўся, тады пайшоў на цэнтр, там адзе магазіны, падходзяць ка мне і гавараць: "Вайна началась!" Ну, тады папрасілі нас, ноччы хадзілі, павесткі ўручалі каму ісці ў ваенкамат, ці на вайну, разнашвалі павесткі па мужчынах. Помню, як людзі плакалі, як іх праважалі, сколька мужчын на дарогу сабралася, сколькі народу было. У нас на центру Калышак сколькі там кріку было. Калі назаўтра вайна началася і адпраўлялі на вайну людзей, женшчыны, знаеш, як крычалі, плакалі ратункі*" (Лёзненскі р-н)[7].

Знайшла адлюстраванне ў дзіцячых успамінах і эвакуацыя калгаснай жывёлы на Усход, асабліва ў тых выпадках, калі ў працэсе ўдзельнічалі бацькі альбо самі падлеткі. У гэтых апавяданнях даволі выразна перадаецца атмасфера няпэўнасці і панікі першых дзён вайны, а сам выган жывёлы выглядае даволі хаатычным, з улікам налётаў авіяцыі люфтвафэ і прарываў перадавых нямецкіх частак. Негатыўна характарызуюцца і прадстаўнікі мясцовай улады, якія спяшаюцца небяспечны край, ратуючыся ўцёкамі. "*Як тут ужо аб'явілі, што вайна, усё ужо, вот так ужо на вуліцы сабраў, стаім, глядзім нямецкі во самалёт адсюль ляціць, – а яшчэ немцаў не было, – а наш ужо ззадзі, і па ім ужо страляў. Ну і тады прэдсядацель сельсавета гаворыць: "Ай, немец далёка, сюды ня прыйдзець". А сам ужо сабраў манаткі. Што было ў сельсавеце, эта ўсё ўкінуў, і гэты прэдседацель на кані ў Віцебск, а там і дальшэ – дзе-та на Урале там ужо яму брон аблажылі, і ён на вайне ня быў. <...> Ну і тады у калхозах былі ужо скот калхозны, свінаферма была, ну і тады ўжо гэты скот адганяць каб во немцу не астаўся. Мой бацька, церaз вуліцу Ягор такі жыў, і пагналі эты скот. Ну і так з усіх калхозаў скот гналі, і гналі сюды, на Сянно. І нашы туды падагналі да Сянна. Там от луг такі, здаровая паляна была, ската было поўна! І вот тут немец, нейкая разведка. Ну вот, нам закурыць далі. Пацямнела, мы ўжо коні свае пазапрагалі – ідзіце вы к чарцям! І дамоў прыехалі к утру. І там эты скот, не знаю. Ну, гналі спецыяльна да Воршы, там жа ужо вузлавая станцыя, каб ужо скот хаця троху ад яго адвезці. Ну і тады ужо немец. І тут пагаворка была, што ўжо усё, ужо Расію немец заберыць...*" (Бешанковіцкі р-н)[8].

Скразной лініяй успамінаў пра першыя дні вайны праходзіць узгадка пра беспарадкавае і хуткае адступленне частак Чырвонай арміі і асобных груп салдат. Дзіцячая памяць фіксуе нібыта дробязі (запы-

[3] ФА ПДУ: Зап. А. Сумко ў 2019 г. ад Стомы Яўгеніі Мікалаеўны, 1931 г.н. у в. Клімяты Мёрскага р-на.

[4] ФА ПДУ: Зап. У. Аўсейчык, У. Лобач у 2018 г. ад Савіцкай Ірыны Сямёнаўны, 1932 г.н. (нар. в. Дзягелева Бешанковіцк. р-на) у в Сіроціна Шумілінскага р-на.

[5] ФА ПДУ: Зап. У. Лобач у 2006 г. ад Аўтух Дар'і Цімафееўны, 1912 г.н. у в. Вашкова Ушацкага р-на.

[6] ФА ПДУ: Зап. Д. Казлоў у 2012 г. ад Ламаносенка Марыі Макараўны, 1931 г.н. у в. Лугі Лёзненскага р-на.

[7] ФА ПДУ: Зап. Д. Казлоў у 2013 г. ад Быкоўскага Міхаіла Фіманавіча, 1927 г.н. у г.п. Лёзна.

[8] ФА ПДУ: Зап. А. Высоцкая, Н. Шыпіла ў 2013 г. ад Белавус Мікалая Мацвеевіча, 1927 г.н. у в. Заполле Бешанковіцкага р-на.

леныя твары, соль ад поту на гімнасцёрках), але гэтыя дэталі маюць знакавы характар у кантэксце драматычных падзей чэрвеня-ліпеня 1941 г. "*Ой, шэсць лет мне было. Ой, помню эта. Ой, вы знаеце што, я помню, знойнае лета было, очань знойнае. Немцы ўжо сталі бамбіць в іюле месяцэ. Помню харашо, што ў мяне брат радзіўся вот 9 іюля, і мама схваціла яго… Самалёты ляталі ж эці немецкія, уже бамбілі. І мы ў акоп, зямлянка такая была вырыта. Кагда началась вайна ўжо людзі сабіраліся, там тры-чатыры хазяіна, і рылі акопы. І патом у этэм акопе мы сядзелі, нескалько там сямей сідзелі в этам акопе, пака бамбілі. А салдаты нашы адступалі, этыя ўжо немцы налялталі, ішлі, у іх ліца не было відна ад пяска, панімаеце? Цяпер во асфальт, асфальціраванныя дарогі, а тагда ж больше пяшчаныя. Дык вот, даже ліцо такое… Вот сядзелі, атдыхалі, я харашо помню. І ўсё адзін мне салдат, ён мяне кружачку, кружку такую металіческую падарыў. Гаворыць, на, на, дочанька, вот даў. Этая кружка ў меня доўга была. І гімнасцеркі…. Вот дзействіцельна ў песні паёцца, "гімнасцёркі на плячах павыгаралі". Вот дзействіцельна, гімнасцеркі былі аж прапітаны соллю, вот такое, што сільна такі санцапёк быў, ну вот помню*" (Бешанковіцкі р-н)[9].

Імклівае прасоўванне нямецкіх матарызаваных частак адразала асобныя падраздзяленні Чырвонай арміі, і ў гэтай сітуацыі частка салдат прымала рашэнне не прабівацца да сваіх, а, пакінуўшы зброю і амуніцыю, зліцца з мясцовым насельніцтвам і, такім чынам, ўратаваць сабе жыццё. "*А на заўтра бамбёжка, стукат. Нашы цікаюць чераз жыта пасеенае. У хату забягуць, каб далі што пераадзець. Яны ўжо акружылі. У каго ёсць, давалі пераадзецца ў вольнае, і каб пажыць. Ну, і пакідалі яны аружае, адзежу сваю…*" (Бешанковіцкі р-н)[10]. Прыватны выпадак дэзерцірства, што запаў у дзіцячую памяць, стасуецца з агульнай тэндэнцыяй, што мела месца на пачатку вайны не толькі на тэрыторыі Беларусі. "Да канца 1941 г. органы НКУС арыштавалі на тэрыторыі СССР, паводле ўласных дадзеных, 710 755 дэзерціраў і 74 541 адмаўленцаў ад вайсковай службы" [4, с. 48].

Зусім іншая карціна падзей лета 1941 г. паўстае ва ўспамінах дзяцей і падлеткаў Заходняй Беларусі. Адсутнічаюць узгадкі пра мабілізацыю, якая па факце і не была праведзена, а тым больш пра эвакуацыю калгаснай маёмасці па прычыне адсутнасці саміх калгасаў. Але характэрнай рысай, якая прыгадваецца, былі рабункі яўрэйскіх крам у Докшыцах і Германавічах яшчэ да прыходу нямецкіх частак. "*Ай, помню, як сёння было. Помню, маць з сястрой пайшлі ў касцёл раніцай на дзевяць гадзін. Гляджу я ў касцёле нікаго нет, а то раньшэ там войска і школьнікі на дзевяць гадзін маліліся, для іх была служба. Там нейкіх дзьве жанчыны, якія сідзяць на гэтых лаўках і ўсё. І мама прышла, гаворыць: "Хадзіце бягом дамоў, – гаворыць, – вайна." І адвяла нас дамоў. <…> А пасля абеда ўжо некаторыя лоўкія пабеглі гэтых яўрэяў у магазіны, там залазілі, што та ў іх бралі*" (Шаркаўшчынскі р-н)[11]; "*Хацелі з Крулеўшчыны дарогу нейкую вясці па балоту. Едуць і едуць людзі, а мая мама выйшла, кажаць: "Куды вы людцы едзіце?" – "Дарогу, – кажаць, – будзім правадзіць жалезную". Чэраз мінут якіх, поўчаса, назад едуць. Мама ізноў вышла: "А чо вы назад едзіце?" – "Бабушка, вайна". Сягоння во гэдак во сказаў, а на заўтра ў Докшыцах і немцы. Гэдак скора яны аб'явіліся. Кажаць, магазіны ўсе жыдоўскія разбіраюць. Тут у нас некатарыя пабеглі за гэтымі. Ну ў нас некаторыя і пабеглі, і па трубке* (палатна – У.Л.) *папрынасілі*" (Докшыцкі р-н)[12].

Да жалю, гэтая ганебная з'ява мела месца не толькі ў памянёных населеных пунктах. "Антыяўрэйскія пагромы і выпадкі марадзёрства адзначалі ў такіх гарадах (у асноўным у Заходняй Беларусі) як Гродна, Навагрудак, Іўе" [10, с. 356]. Інфарманты ўзгадваюць пра факты рабаўніцтва безэмацыйна, як пра падзею, што проста мела месца ў іх мясцовасці. Але, насамрэч, гэтыя ўзгадкі – вуснае сведчанне антысеміцкіх настрояў, характэрных для Заходняй Беларусі ў цэлым, і падаграваемых Польскай дзяржавай. У канцы 1930-х гг. "у Польшчы разгарнулася шырокамаштабная антысеміцкая кампанія, падобная да той, што мела месца ў фашысцкай Германіі. Адным з найбольш папулярных лозунгаў гэтай кампаніі быў заклік "Свой да свайго!" ("Swój do swego"), які агітаваў палякаў купляць тавары толькі ў польскіх крамах" [10, с. 356]. Памяць пра тую антысеміцкую кампанію захавалася ў жыхароў заходніх раёнаў Віцебшчыны дагэтуль. "*А ў нас і брашурка была такая, штобы ў жыдоў нічога не пакупалі. Вот і сядзіць жыд на дзеньгах, мешок дзенех, а крэсцьянін яму сапагі чысціць, ногі выценуўшы*" (Мёрскі р-н)[13].

У выпадку Чаславы Хрол з Глыбоччыны, першы жах вайны быў звязаны не з налётамі нямецкай авіяцыі, але з убачаным на лясной дарозе, па якой супрацоўнікі НКУС з сабакамі гналі вялікую калону зняволеных. "*З Беразвечча іх гналі, з Баразвэчча туды, на Ўшачу іх гналі. Я ішла у Шо да цёткі, пайду у Шо, і гэтай дарогай, я ня тутака ішла, а вось з гэтага канца. Во хаджу за канец дзярэўні і там жа мне паварачваць у Шо. Гляджу нейкая сціна. І гэна дарога. Гэтай дарогай яны іх гналі, там ужо меней было там хат, там ужо лесам болей гналі. Стаю і гляджу. А тады гляджу і сабакі, і канваіры з бакоў. А іх*

[9] ФА ПДУ Зап. У. Аўсейчык у 2014 г. ад Раўковай Галіны Сідараўны, 1927 г.н. у в. Соржыца Бешанковіцкага р-на

[10] ФА ПДУ: Зап. Д. Казлоў у 2013 г. ад Папко Марыі Нікіцічны, 1930 г.н. у в. Жарнасекава Бешанк. р-на.

[11] ФА ПДУ: Зап. У. Лобач у 2008 г. ад ад Бурэц Францішкі Мікалаеўны, 1924 г.н. у в. Германавічы Шаркаўшчынскага р-на.

[12] ФА ПДУ: Зап. У. Лобач у 2009 г. ад Чэчыкалавай Ганны Лаўрэнцеўны 1930 г.н. у в. Дзедзіна Докшыцкага р-на

[13] ФА ПДУ: Зап. У. Лобач у 2019 г. ад Патрымайла Тэклі-Тэрэзы Георгіеўны 1929 г.н. у г. Дзісна.

*гналі дык там адзін прыд адным. Гэтак блізенька адзін прэд адным. І я не знаю, ці яны былі звязаны гэтым цэпямі, я ня ведаю, толькі барабанілі гэты цапы, я ні знаю. Ці, можа, яны у іх адзін к аднаму папрывязаныі былі. Ну я стаю… А тады адін як раўкнул на мяне: "Чаго стаіш?" Ну, ціханька сабралась і пайшла. І йіх толькі дагналі толькі да Вулы. І тутка ўжо йіх некалі ўжо было гнаць і тады іх у Вуле усіх растралялі. І вот наш з Хралоў быў там разам мужчына, катарый я во казала, што забралі сразу, як савецкая власць прыйшла. А ён астаўся жыў. Там і мёртвыі і жывыі, усе ліжалі. А як яны ужэ паехалі, ужо пабілісь, ён падняўся, а тут немцы найшлі, як ужо немцы прыйшлі, тады ён ужо туды. Во як білі людзей страшна. [А ці многа там людзей вялі?] Я канца на дарозе і начала ня відзіла… Ну, ніхай, кілометры два абізацельна былі дліной гэта людзі. Як страшна. Тады прыйшла тату кажу ён мне тады сказаў маўчы ціханька, нічога не кажы. Каб нічога не сказаў, нічога ні чуў хто*"[14].

Жудасная гісторыя, што захавалася ў памяці падлетка на ўсё жыццё, мае і не менш страшнае дакументальнае пацверджанне ў службовай перапісцы кіраўніцтва НКУС БССР. "Вчера, 4 июля, мною арестован и предан суду ВТ [бывший] начальник тюрьмы Глубокского района Вилейской области, ныне начальник Витебской тюрьмы, сержант госбезопасности, член ВКП(б), который 24 июня вывел из Глубокской тюрьмы в Витебск 916 осужденных и следственно-заключенных. По дороге этот начальник тюрьмы Приемышев в разное время в два приема перестрелял 55 человек, а в местечке около Уллы, во время налета самолета [противника] он дал распоряжение конвою, которого было 67 человек, перестрелять остальных, и было еще убито 65 [человек]. В этих незаконных расстрелах он сам принимал участие с револьвером в руке. Свои действия объясняет [тем], что якобы заключенные хотели бежать и кричали: "Да здравствует Гитлер!" <…> По его [Приемышева] заявлению... было перестреляно 714 заключенных. Нами по личным делам установлено, что среди этих заключенных более 500 человек являлись подследственными, и несмотря на это без всяких оснований они все же были незаконно перестреляны"[11]. Застаецца дадаць, што забойца нявінных людзей так і ня быў пакараны.

**Нямецкія салдаты**. Практычна ва ўсіх успамінах пра падзеі 1941 г. акцэнтуецца надзвычай імклівае прышэсце нямецкай арміі. Гэтая хуткаць у часавым вымярэнні гіпертрафуецца, адбываецца своеасаблівая ментальная кампрэсія часу, калі, па сведчанні рэспандэнтаў, першыя нямецкія аддзелы аб'явіліся ўжо праз адзін-два-тры дні пасля пачатку вайны. З'яўленне нямецкіх танкаў, паводле ўспамінаў, здарылася ўжо па абедзе таго дня, калі пачалася вайна: "*І мама прышла, гаворыць: "Хадзіце бягом дамоў, – гаворыць, – вайна" І адвяла нас дамоў. А тут пасля абеда танкі, танкі, танкі каля Дзісны…*" (Шаркаўшчынскі р-н)[15]. Падобная хранaлагічная недакладнасць не з'яўляецца спробай свядома сказіць рэаліі колішніх падзей. Справа ў тым, што "час у дзіцячых успамінах мае асаблівую працягласць і вельмі рэдка стасуецца з дакладнымі датамі" [7, с. 99]. Больш за тое, ігнараванне каляндарных дат (апрача святаў) з'яўляецца адзнакай традыцыйнай карціны свету ў цэлым, для якой заўсёды першаснай выступае падзея, прэцэдэнт, а дакладная храналогія ў разлік практычна не прымаецца.

Вобраз нямецкіх салдат ва ўспамінах пра лета 1941 г. надзвычай разнастайны, што абумоўлена канкрэтнымі абставінамі першага кантакту, сацыя-культурным кантэкстам і асаблівасцямі культурнага ландшафту, дзе гэты кантакт адбыўся. Але найперш ідэнтыфікацыя "чужога" адбывалася паводле базавых культурных маркёраў – знешняга выгляду і незразумелай мовы: "[А якія гэты немцы былі? Што за людзі?] *Ну, людзі, як людзі. Толькі не як нашыя адзетыя. І только як "**гыр-гыр-гыр**"па-свойму*" (Полацкі р-н)[16]; "*А як у хаты прыхадзілі, яны па свойму **ялдэчуць** і ўсё. Ды і што, яны ж ня білі нікога, прыйшоўшы ў хату там, не ругалі там. То не знаешь, можа ён і ругаець, языка не знаець. Там гэта ўжо навучыліся: матка, масла, матка, яйка…*" (Мёрскі р-н)[17]; "*Стаім мы рабяты. Ой, як прыехалі на матацыклах, як **закурдуячылі**! А хто ета, а што ета? А папугаліся! Толькі:"Матка, яйкі, шпік!" Давайце ўжо ім вынасіці*" (Шумілінскі р-н)[18].

Ва ўсходніх раёнах Віцебшчыны, дзе савецкія ўлады паспелі правесці мабілізацыю, вясковае насельніцтва ўспрымала прыход немцаў надзвычай насьцярожана па прычыне таго, што значная колькасць мужчын (сыноў, братоў, бацькоў) ужо знаходзілася ў шэрагах Чырвонай арміі. Адсюль, жаўнеры вермахта ўспрымаліся як салдаты не проста "чужой", але менавіта "варожай" арміі [12, s.80]. Гэтае меркаванне ўзмацнялася пад уражаннем ад рабункаў, якія татальна ўчынялі нямецкія салдаты ў беларускіх вёсках, што спараджала страх у вяскоўцаў. "*Яны ж прыйшлі к нам у дзярэўню, Божачка, прыехалі, і с танкамі. І яны з танкамі сталі там і стаяць. Божачка, за курамі бегалі па двару і стралялі курэй. Яны ж мяса, ім нада!*

[14] ФА ПДУ: Зап. У. Філіпенка ў 2010 г. ад Хрол Чаславы Браніславаўны, 1926 г.н. у в. Хралы Глыбоц. р-на.

[15] ФА ПДУ: Зап. У. Лобач у 2008 г. ад Бурэц Францішкі Мікалаеўны, 1924 г.н. у в. Германавічы Шаркаўшчынскага р-на.

[16]ФА ПДУ: Зап. Т. Валодзіна, У. Лобач у 2017 г. ад Баранавай Тамары Іванаўны, 1934 г.н. у в. Грамошча Полацкага р-на.

[17] ФА ПДУ: Зап. У. Лобач у 2019 г. ад Александроўскай Феафаніі Васільеўны, 1928 г.н. у в. Язна Мёрск. р-на.

[18] ФА ПДУ: Зап. У. Аўсейчык, У. Лобач у 2017 г. ад Ходзікавай Таццяны Аляксандраўны, 1935 г.н. у в. Светлічашча Шумілінскага р-на.

*А мы ўжо баяліся і з мамай, мы ўжо ні слова не гаварылі. Нічога. А яны, брат ты мой, з пісталета застрэлюць курыцу і заберуць. Во як было! Не дай Бог, не дай Бог!*" (Бешанковіцкі р-н) [10, с. 224]; "*Як прышлі, я помню. У кароткіх штанах, у бацінках, у такіх, з жалезамі. І кароценька па дзярэўні шлі: Матка, яйкі, шпэк! Дала ім усе. Курэй сабіралі, усе пабіралі. Ну, так помнілі гэта*" (Полацкі р-н)[19].

З'яўленне ў вясковай прасторы дагэтуль нябачнай тэхнікі варожых войскаў выклікала ў дзяцей (пераважна хлопчыкаў) цікавасць, якая межавала са страхам, а нямецкія салдаты пры гэтым надзяляліся дэманічнымі рысамі. Але цікаўнасць пераважвала страх у выпадку, калі дзіця бачыла незвычайныя і цікавыя з яго гледзішча рэчы. "*Вот сказалі нам: "Немцы ідуць…" Вот рабяты, мальчышкі на крышу ўзлезлі, глядзяць, кагда ж тыя немцы паедуць. А яны ў аснаўном ехалі на матацыклах. Машыны крытыя і матацыклы, з люлькам усё. І іх там сядзіць на матацыкле, сколькі там, тры, наверна, немца. Ну вот, увідзелі тыя мальчышкі з крышы, што едуць немцы з Вархоў, з другой дзярэўні. А мой брат так спугаўся, стаў на вакно і скрабаець рукам у вакно. Ня ў дзверы ўжо кінуўся уцекаць ад немцаў, а ў вакно лезіць. Ну, і ўжо тады прыйшлі ужо немцы. Ай, усіх баёмся, но ў нашай дзярэўні яны нікога не ўбілі, нікога не спалілі. Пачаму? Патаму, што ўсе мужчыны былі на фронце. А немцы мне казаліcь, што я – рябенак тады была, бальшыя, такія насатыя, страшныя яны мне казаліcь. Ну, а тады што. Мыюцца гэтыя немцы і абмылкі гэтыя кідаюць куды-та там на памойку. І красівенькія, і сіненькія, і зялёненькія. І давай рабяты падбіраць*" (Гарадоцкі р-н)[20].

Падлеткавыя ўспаміны захавалі памяць і пра неаднароднае стаўленне вяскоўцаў Усходняй Беларусі да прыходу нямецкай арміі. Рэпрэсіі, жорсткая антырэлігійная палітыка і сістэма калгаснай эксплуатацыі спарадзілі нямала праціўнікаў савецкай улады, якія звязвалі з прыходам немцаў сваё спадзяванне на лепшае жыццё. Дакладней, вяскоўца ў найбольшай ступені хвалявала скасаванне калгаснай сістэмы і вяртанне сваёй зямлі, чым перамена ўлады. У сённяшніх развагах аб прычынах масавай здачы ў палон салдат Чырвонай арміі рэспандэнтка рэтранслюе свой колішні жыццёвы досвед, сплецены з тагачасным калектыўным меркаваннем. "*Жылі раньшэ харашо, як дабралі зямлю і пахалі самі. А як сталі калхозы, па поснаму ідзеш, яно будзець касцер… Год работалі дарма, не палучалі нічога, а тады ўвосенню этага касцяру… Харошага жыта дадуць гасударству. А касцель эты, во веткі такія, як эта. І нам на трудадні па сколька грам выхадзіла, палучым, ужо сабраўшы, малаціўшы. Дадуць сколькі этага касцяру, і жылі... Еслі б толькі не калхозы, выйгралі б нашы вайну (у 1941 г.). Калхозы ім надаелі, здаваліся ў плен…[Яны здаваліся ў плен, што калхозы былі?] Хацелі дамой, надаеў калхоз, што* ***нехай немец будзе, каб толькі калхозаў не было***" (Лёзненскі р-н)[21]. Аднак, пры ўсіх стоеных спадзяваннях на ліквідацыю калгаснага ладу, вясковая супольнасць асуджала непрыхаваную радасць з нагоды прыходу нямецкай арміі, бо падобная маніфестацыя азначала, што аднавяскоўец выказвае жаданне быць "сваім" сярод "чужых". "*І не ў каго нічога не было, ні какіх сведзеняў, толькі радзіо крычала: куда немцы прадвінулісь, дзе вайна, дзе што. І ўдруг, не з таго не з сяго, на двух матацыклах, матацыклы такія з люлькамі, немцы прыехалі ў дзярэўню. Высапаліcь людзі, сматрелі, як на прывідзенье. Хто са страхам, канечна. <…> Быў чалавек адзін такой, катораму не саўсем было… нармальна, более-менее… зажытачна яны жылі. Ну, наверно, у серцы, можа какое недаверые было. Ён выйшаў з хлебам к ім. К немцам. З соллю, з хлебам. Усе людзі на няго зарыкалі, замахалі… І ўсе аж баялісь, как гэці немцы паступяць. А этат сказаў: "Прыветствуем вас, паночкі". Людзі канечна усе проціў, усе зарычалі, а немцы тут нешта тожэ. Што-то закрычаў гэты па-рускі, спакойствіе, ці што ён сказаў. Ну, на гэта ён так сказаў: "А што тады та ўласць не нравілась?" А ён: "Мы вас, паночкі, ждалі". А ён гаварыт: "Ну, раз цебе та ўласць не нравілась, дык навернае і наша не панравіцца. І другой сказаў: "Вэк". І ён скрыўся. Людзі дужа яго тады карылі і больше яны гэтага старога чалавека не прізнавалі*" (Бешанковіцкі р-н)[22].

Сведчанне вуснай гісторыі пра антысавецкія настроі знаходзіць пацверджанне ў тагачасных дакументах як з савецкага, так і з нямецкага боку. Так, "…партызанскі атрад НКУС, які накіроўваўся ў раён сваіх дзеянняў вакол Полацка, сустрэў па-антысавецку настроеных сялян "Яны аддалі сваю жывёлу немцам… Некаторыя гаварылі, што немцы прыйшлі, каб вызваліць іх…" [4, с. 46]. У рэляцыях армейскага Галоўнага камандавання вермахта аб становішчы на акупаваных тэрыторыях паведамляецца, што "адносіны насельніцтва да немцаў усюды, у тым ліку ў раёне Віцебска, Оршы, Магілёва адзначаюцца як дружалюбныя. Адмаўленне бальшавіцкага панавання можна адзначыць усюды, аднак, галоўным чынам, з эканамічных і сацыяльных прычын" [4, с. 49].

Куды больш трагічным было першае "знаёмства" з нямецкай арміяй у тых мясцовасцях, дзе вяліся жорсткія абарончыя баі, як тое было ў зоне Полацкага ўмацаванага раёна. "З 9 ліпеня разгарэлася бітва

[19] ФА ПДУ: Зап. Лобач У., Сумко А. у 2018 г. ад Скачыхіна Васіля Міхайлавіча, 1936 г.н. у в. Мураўі Полацкага р-на.

[20] ФА ПДУ: Зап. Т. Валодзіна, У. Лобач у 2011 г. ад Ганчаровай Марыі Ульянаўны, 1936 г.н. у в. Езярышча Гарадоцкага р-на.

[21] ФА ПДУ: Зап. У. Лобач у 2015 г. ад Лаўніховіч Марыі Сямёнаўны, 1924 г.н. у в Бабінавічы Лёзненск. р-на.

[22] ФА ПДУ: Зап. У. Аўсейчык, У. Лобач у 2018 г. ад Савіцкай Ірыны Сямёнаўны, 1932 г.н. (нар. в. Дзягелева Бешанковіц. р-на) у в. Сіроціна Шумілінскага р-на.

ўжо на Баравускім напрамку, куды прыйшоўся ўдар каля 100 нямецкіх танкаў, падтрыманых пяхотай. Тут на працягу дня часткі А.І. Зыгіна вялі жорсткія баі з праціўнікам, наступаючым і блакуючым ДОТы ў пунктах Заручаўе, Залессе, Асяроткі, Махірова" [13]. За сухім паведамленнем гістарычнай хронікі немагчыма зразумець, што абарончыя "пункты" – гэта вёскі з жывымі людзьмі, якія трапілі ў самае пекла жорсткіх баёў. Дзіцячыя ўспаміны жыхаркі в. Асяроткі дазваляюць зразумець жудасць вайны не праз сухія лічбы і факты афіцыйнай гісторыі, але праз эмоцыі і адчуванні простай вясковай дзяўчынкі. "*Як прышлі танкі первые… Аб'явілі – вайна, не ўспелі аглянуцца – танкі прышлі. І тут ДОТы толькі адстроілі, всё як нада быць. А ў ДОТ адзін завезены тарэлкі былі. Не снарады прывязлі там, ці патроны там, а прывязлі тарэлкі, запечатываныя ў каробках. І салдат нашлі. Раздутыя, гімнасцёркі распёрла. І мы бегалі туды і наглядзеліся. А яны, бедныя, лежалі раздутые салдаты, у гэтых ДОТах. Як ішлі немцы, так і пашлі. Танкі прышлі ў дзярэўню, запалілі дзярэўню, а мы – ў лес. Махерова после спалілі, нас спалілі, як ешчо прышлі толька, танкі прышлі – сразу сталі паджыгаць дзярэўню. Зразу*" (Полацкі р-н)[23].

Дзіцячыя ўспаміны жыхароў заходніх раёнаў Віцебшчыны дэманструюць зусім іншую карціну прыходу нямецкай арміі і рэакцыі мясцовага насельніцтва на авангарды вермахта. "Камандуючы паліцыяй бяспекі і СД у Генерал-губернатарстве ў канцы чэрвеня 1941 г. паведамляў, што "польскае насельніцтва на тэрыторыі рускіх інтарэсаў усюды выказвае задавальненне прыходам немцаў. У розных вёсках для нямецкіх войскаў узводзіліся трыумфальныя аркі" [4, с. 49]. Вусныя сведчанні ў поўнай ступені пацвярджаюць дакументальную інфармацыю. "*Як там у Лужках іх ўстрычалі, я ня ведаю, ну гаварылі, што некаторыя там устрычалі з букетамі*" (Шаркаўшчынскі р-н)[24]; "*Наступаў немец праз Докшыцы. І мы ж, гэткія дзеўчукі, паляцелі ж глядзець немцаў. Ну, дурные ж гэдкія. Дык нарвём цвятоў гэдулькі і кідаем ім у машыну*" (Докшыцкі р-н) [10, с. 270]. Зразумела, што рэакцыя вясковых дзяцей на нямецкіх вайскоўцаў не магла быць стыхійнай і адвольнай, але цалкам стасавалася з меркаваннем бацькоў і т.ч. адлюстроўвала калектыўнае ўспрыняцце салдат вермахта, як "вызваліцелей" ад савецкага гвалту.

Спецыфікай дзіцячага ўспрыняцця першых нямецкіх салдат было тое, што іх ацэнка міжволі адбывалася ў параўнанні з савецкімі салдатамі, што з'явіліся на тутэйшых абшарах у верасні 1939 г. Хуткая перамена адных "чужых" на іншых дазваляла зрабіць наўпроставае візуальнае параўнанне іх аблічча і паводзін. І вельмі часта перавагу ў ацэнках мелі нямецкія салдаты. "*А яны наступалі самі спакойныя. Гарэлка ім не нада была. Во, ім толькі, яны ехалі, падвяліся, адзекалоніліся і ўсё. Дзялоў нет. Салдат ішоў рускі, або бутылка самагонкі – дык гімнастёрку з плеш снімаў, а яны – не*" (Глыбоцкі р-н)[25]. Знакавай стае тая акалічнасць, што сам факт змены ўлады ў дзіцячых успамінах папрост канстатуецца, але ніякім чынам не ацэньваецца. У цэнтры ўвагі былі знешнія прыкметы і характарыстыкі (форма, транспартныя сродкі, паводзіны, атрыбуты, пачастункі), якія, пры ўсёй сваёй фармальнасці, былі знакавымі для дзіцячай карціны свету. Вельмі выразна ацэначныя прынцыпы і катэгорыі маленькага чалавека, які быў сведкам падзей 1939 і 1941 гг., прадстаўлены ў вусных успамінах, запісаных на Шаркаўшчыне. Немцы прыгадваюцца як "сіяюшчыя", "блісцяшчыя" паводле прыгажосці сваёй формы, яны дэманструюць у вясковым свеце дзівосы (фотаапарат, машыны, матацыклы), якія "век не відзелі", але ўсё адно ўсведамляюцца як "людзі другія", адрозныя ад "нашых". Вельмі кантрастна, адносна немцаў, выглядаюць ва ўспамінах рускія салдаты: "пыльныя", "грязныя", "на конях", бо "не нажылі машыну". Пры гэтым, да рускіх салдат не выказваецца ні злосці, ні пагарды, але выключна шкадаванне ("бедныя рускія"), агульнае для ўсёй вёскі, што дае адступаючым байцам прадукты. Але паказальна тое, што рускім салдатам даюць хлеб на дарогу, а нямецкіх сустракаюць кветкамі.

"*Ну вот, прыйшлі рускія. Я была маленькая. (…) Ну і тады што. Кажыць, рускія едуць… І гэтыя салдаты, рускія, без вайны, не стралялі, ціхенька, проста ехалі і ўсё. На чым? На калёсах такіх бальшых. (…) І тады мама кажа: "Пайдзём на дарогу глядзець, што там робіцца". Тока такі стукат – не машыны ж гэта, а коні і цялегі. Аж тут гэтыя цялегі такія длінныя і салдат поўныя гэтыя вазы, і на конях салдат. Ні адной машыны. Машын не было. Ну і тады ўсё. Дзякуй Богу, ужо рускія ў нас. Усё. Власць.*

*У 43-м немцы апяць напалі на нас. Ой, тады як ішлі ўжо немцы. Кажуць, ужо рускіх праганяюць немцы, немцы ідуць. Бедныя рускія. Мы апяць да дарогі. **Пыльныя, грязныя**. Тожа ж машын не было, не нажылі машыны. На конях, конныя, на гэтых калёсах, уцякалі ужо ад нас, ехалі, проста ехалі, ціхенька ехалі. Ой, людзі хлеба давалі ім, усё кідалі і кідалі. Астанаўлялі. Вазьміце есці. Што ў каго было. <…> Назаўтра, кажуць, немцы ўжо едуць. Немцы, нядзеля, вродзе бы, была. А я забаялася, мне нада было да першай споведзі. <…> Немцы прыйшлі ў касцёл. Ой, а **сіяюшчыя, блісцяшчыя**! Там проста сіялі два*

[23] ФА ПДУ: Зап. У. Лобач, А. Сумко ў 2019 г. ад Гураўчанка Валянціны Грыгор'еўны, 1928 г.н. у в. Махірова (нар. у в. Асяроткі) Полацкага р-на.

[24] ФА ПДУ: Зап. У. Лобач у 2008 г. ад Бурэц Францішкі Мікалаеўны, 1924 г.н. у в. Германавічы Шаркаўшчынскага р-на.

[25] ФА ПДУ: Зап. У. Лобач у 2019 г. ад Сініцы Пятра Тамашавіча, 1926 г.н (жыхар в. Вуглы) у в. Празарокі Глыбоцкага р-на.

*немцы. Аглянуліся мы, а тут два немцы стаяць, у касцёле. Ой, божанька, аж страх! Проста мы спужаліся. Што нашы – гэта нашы, як мы, так і яны – роўныя людзі, а гэта ўжо людзі другія. Вот так. Сіяюшчая форма на іх, невядома якая. Добра. І тады ксёнз кажа: "Выйдзем усе на ганак, кумунію будзем браць". <…> І яны сталі между. Ксёнз пасярод, а яны: адзін з адной стараны, другі з другой. І гэтак з намі сфатаграфіравалісь. <…> А фотапарат, что я век не відзела. Ну, тады нічога не было ў людзей. На ножках. І вот так – мах, помню як цяпер, закрыўся, гэтак фатаграфаваў нас. Ну, але ж картачкі мы не палучылі, яны ж паехалі куды, хто іх ведае. Вот так было, як ішлі да нас немцы. Ой, тады прыйшла я дамоў… і тут мама кажа: "Пайдзем глядзець". А дзярэўня вялікая, людзей гэтых поўна. Усе вышаўшы. Тут, у вуліцы стаяць. Маладзёжы…Божанька мой! Кідалі ім кветкі на машыны. То там машыны сіялі, там не коні ж, там машыны сіялі. Там, ой, матацыклы, усё на свеце! Век мы не відзелі таго, што там відзелі. Вот так было. Вот. Ну, і паглядзелі. Ну што ж. Прыйшлі немцы. Будуць немцы*"[26].

Аднак ілюзіі адносна нямецкай арміі ў заходніх раёнах Віцебшчыны (Беларусі) трывалі нядоўга, бо, як адзначыў Б. К'яры, ужо "ўлетку 1941 г. мусіла выявіцца тая акалічнасць, што на месца камуністычнага тэрору і саветызацыі прыходзіла пашырэнне гвалту ў дагэтуль нябачных памерах" [2, с. 65]. Гэты тэзіс знаходзіць пацверджанне і ў матэрыялах "вуснай гісторыі", дзе відавочнай стае сутнасная эвалюцыя ацэначных поглядаў на нямецкіх вайскоўцаў.

"Дык вот я помню, як у 41-м гаду мы з папам пайшлі глядзець. Ну, мне было сколька, ну 4 гады, і мы сядзім так на скамеечках, а шоў абоз сюда, на Полацк да нас. Немцы, фуры такія ішлі крытыя, ну там можа прадукты вязлі... Помню, едзіць легкавая. Ну, ужо едзіць афіцэр, там ужо не знаю, якое там званне ў яго было. Афіцэр быў і ўжо ўгашчаў мяне канфетамі. Ну, дык гэта было первае, первае. Гэта так мне запомніліся первыя немцы. А патом ужо былі, Божа мой! Патом ужо было тут у нашай местнасці, яны не ўспелі тут папаліць, ну яны ж прыхадзілі, усё грабілі, яны ж не счыталісь ні з чым.… Бралі, што ім нравілася. Ну, в обшчэм, грабілі і ўсё (Шаркаўшчынскі р-н) [10, с. 307].

**Ваеннапалонныя**. Пры ўсіх адрозненнях у візіі падзей 1941 г., успаміны жыхароў заходняй і ўсходняй Віцебшчыны яднае аднолькавая эмацыйная рэакцыя на лёс савецкіх ваеннапалонных на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Мноства сведчанняў з розных куткоў рэгіёна пра здзекі і забойствы ваеннапалонных нямецкімі салдатамі абумоўлена тым, што летам 1941 г. на тэрыторыі Беларусі ў палон трапіла велізарная колькасць салдат і камандзіраў Чырвонай арміі. "Войскі групы армій "Цэнтр" узялі ў палон з 22 чэрвеня да 24 ліпеня 1941 г., паводле іх дадзеных, 520 058 байцоў і камандзіраў…" [4, с. 40]. Успаміны пра растрэлы бяззбройных, згаладалых людзей траўматычныя нават у сённяшнім дні і пераказваюцца сведкамі падзей даволі цяжка, з відавочным эмацыйным болем ад калісці пражытага жаху. "*І **самае страшнае** было, кагда гналі пленных. Як калонамі, такія паслабеўшыя… Насілі хлеб, Божачка, насілі хлеб і бульбу, кідалі. Канваіры з сабакамі не падпускалі, у пярод неяк троху падпускалі, а после не сталі падпускаць… Гналі пленных, застрэлілі, абарваныя, босыя, галодныя. Як я ўвідзела, з папам тады была, насіла, як увідзела гэта – і болі мяне мама не пусціла, не пусціла. Каля дарогі адны магілкі былі пленных, после вайны ўжо сабралі ўсё гэта астанкі. Ну што, пры немцах страшна было, дужа страшна, не дай Бог!*" (Мёрскі р-н)[27]; "*Знаеце што, вот я, як успамінаю, як гэта ўсе на маіх глазах было, я не магу, у мяне душа слёзамі заліваецца, як немцы тутака… Пленныя, і бралі гэтых пленных. І па гэтай дарозе гналі гэтых пленных. А як гонюць пленных, каждый дом знаў што, можа, і мой тамака сын ёсць, ці хто-небудзь… Яны ж галодныя былі, галодных іх гналі. І тады яго, значыць, сейчас з гэтага строя на абочыну, дастаець пісталет – "бах" – і застрэліць. І ён ляжыць на баку гэтай дарогі…*" (Мёрскі р-н)[28].

Ва ўсходніх раёнах Віцебшчыны, дзе савецкія ўлады паспелі правесці мабілізацыю, здзекі над ваеннапалоннымі і іх забойствы ўспрымаліся надзвычай балюча, бо ўбачанае на свае вочы азначала, што такі ж самы трагічны лёс можа чакаць і блізкіх людзей (бацькоў, сыноў, братоў), якія пайшлі на фронт. Спагадлівасць і памкненне хоць нечым дапамагчы палонным салдатам была агульнай рысай беларускай вёскі ў ваенны час. Аднак псіхалагічная траўма ад убачанага на бальшаку застаецца ў сведкаў трагічных падзей на ўсё жыццё. "*Пленных ганялі з Баравухі, Махірова, Плігаўкі, Кушлікі, Крумплева і сюды, на Замушча, пленных нашых. Вот ужо мы чуем, як ужо гонюць, тады так немцы з сабакамі. Ну вот, а тады быў бальшак такі, канава была. Мы ў гэту канаву паставім бочку, вады налiём. А жарка летам, летам жа ж была жарышча. Паналіваем вады, бульбы гэтай пячонай накідаем па дароге. Па дарозе ён ужо бяжыць, там ухваціць што. Ну вот, адзін гэтат салдат, мне помніцца, я яго на ўсю жызнь запомніла, такі высокі, з пленных. Быў агарод пасаджаны, там буракі раслі. І ён з гэтага строю выскачыў у гэтат агарод і вырваў чатыры бурачкі. А яго немец убіў. Тут на месце і убіў. Ляжыць, і бурачкі ў руцэ*" (Верхнядзвінскі р-н)[29].

---

[26] ФА ПДУ: Зап. экспедыцыя ПДУ ў 2008 г. ад Юзэфы Казіміраўны, 1932 г.н. у в. Германавічы Шаркаўшчынскага р-на.

[27] ФА ПДУ: Зап. А. Сумко у 2019 г. ад Стомы Яўгеніі Мікалаеўны, 1931 г.н. у в. Клімяты Мёрскага р-на.

[28] ФА ПДУ: Зап. У. Лобач, А. Сумко у 2019 г. ад Майсеёнак Ліліі Генадзьеўны, 1932 г.н., в. Завуцце Мёрскага р-на.

[29] ФА ПДУ: Зап. У. Лобач у 2019 г. ад Мядзелец Антаніны Пятроўны, 1930 г.н. у в. Нурава Верхнядзв. р-на.

Нярэдкімі былі выпадкі, калі вясковыя жанчыны ратавалі з палону абсалютна незнаёмых людзей, выдаўшы іх за сваіх крэўных (мужа, сына). “*Забіралі немцы ў плен. І вот прыйшлі к маме маей, мама мая была сільна жаласлівая, два. Адзін з Ленінграда, Міша Васянкоў, но ён пагіб у партізанах, і Баріс. А Баріс той после вайны выжыў і прыязджаў ка мне, разысківаў нас. Мамка мая ўжо памёрла, но ён на кладбішча са мной хадзіў… Мама мая жаласлівая, узяла ды і пусціла гэтых пленнікаў панучываць. А жраць жа нечага даць. Ну, бульба была дробненькая. – “Цётачка, дай хоць бульбіну”. Мама гаворыць: “Ну, наце па тры бульбінкі, многа ж ня ещце, вашы ж жаваты пустыя”. Яны з’елі і занучувалі. А назаўтра выганяюць на пастраеніе, немец па хатах і выганяіць. А на маму: “А ета пленнік? Плен?” Шапку здзеў, а ў яго ж валасоў нет, яны ж стрыжаныя былі, салдаты. <…> А мама: “Панок, – бах на каленкі, – ета мае сынкі. Кінулі вінтоўкі і прыйшлі дамой”. Заступілась за етых, за пленнікаў. І тады ён: “О, я, я, гуд, гуд, не нада ў партызаны, а то я застрэлю”. <…> Тады еты пленнікі, ім выхуду нет, яны сечас разузналі, дзе тут ужо партізаншчына і жмыкнулі ў партізаны*” (Бешанковіцкі р-н)[30].

Савецкія ваеннапалонныя на тэрыторыі Беларусі не ў малой ступені склалі аснову партызанскага руху, што, у сваю чаргу, пацягнула за сабой экскалацыю гвалту і тэрору з боку акупацыйных улад, ахвярамі чаго найперш станавілася мірнае насельніцтва. Гэтая ўзаемасувязь і паслядоўнасць падзей агучваецца ва ўспамінах як уласнае разуменне чалавекам прычын паразы нацысцкай Германіі, дзе на першым месцы стаіць не разгром на франтах, а бязлітаснае, нялюдскае абыходжанне з ваеннапалоннымі. “*Дык вот пленныя… Каб немец тады, у гэты мамент не стрэляў гэтых пленных… Ён травінку атарваць сагнуўся на дарозі, вадіцы ўхапіць сагнуўся, а немец – трэсь – і забіў. Яшчэ другі сагнуўся, а ён – трэсь! Ай, пленных пагналі, мне тады было 16 гадоў…, а мой брат быў на вайне. Пашлі ўсе іскаць у каго на вайне пабітыя. Пленных немец гнаў, а там у карманчыках, во тут у штанах, адраса. Такая трубачка у салдацікаў, і там адраса. Мы падойдзем, ай, кажа, ня мой. Гэта адкуль, ён не жывый, кроўю сыйшоў. Ляжыць адзін тут, тады другі. Па ўсім бальшаку гэтых трубачак назбіралі во такія прыгоршчы. На, Ірына, табе, ты болей граматная. Послі вайны мы паадпісываем ім. А тады нас усіх спалілі і хаты, і нікому мы і не адпісалі. Дык вот, як паступіў так немец, як стаў убіваць, во тады яны абдумаліся і ўсе ў лес. Страляй. Аднаго застрэліш – апяць уцячэць у лес. Токі дзе дарога кала лесу, так яны – шмыг. А Ушацкі раён…, а там – адны лясы, балоты такія. Дык там накапілася гэтых салдацікаў поўна і арганізавалі парцізаншчыну. А каб ён, немец гэты, гэтых пленных не стрэляў, ён ба аж у Маскву лёгенька зашоў бы і не было б гэтага – ні парцізан, ні ўбійства*” (Лепельскі р-н) [14, с. 248–249].

Пакутніцкі лёс савецкіх ваеннапалонных і нечуваны гвалт над імі з боку нямецкіх салдат, які адбываўся на вачах у людзей, сталі грунтам татальнага недаверу і страху з боку беларускага, пераважна вясковага, насельніцтва. Халакост і спусташальныя карныя экспедыцыі, канцэнтрацыйныя лагеры і гвалтоўны вываз на прымусовыя працы ў далейшым толькі паглыбілі гэтыя пачуцці і канчаткова далі зразумець злачынную сутнасць “новага парадку”, прынесенага ў Беларусь нацыстамі.

**Заключэнне**. Аналіз вусных успамінаў “дзяцей вайны” пра пачатковы этап Вялікай Айчыннай вайны ў супастаўленні з дакументальнымі крыніцамі паказвае, што вусная гісторыя аб’ектыўна адлюстроўвае падзеі 1941 г. Ідэалагічныя напластаванні і скажэнні пасляваеннага часу альбо адсутнічаюць, альбо мінімальныя, што не адмяняе даставернасці наратываў такога роду. Асаблівасцямі дзіцячых (падлеткавых) успамін пра вайну выступаюць іх эмацыйнасць, вобразнасць, метафарычнасць, прывязанасць да гісторыі ўласнай сям’і, а таксама звяртанне ўвагі на дэталі, нерэлевантныя для свядомасці дарослага чалавека. Разам з тым, у апавяданнях пра 1941 г. рэспандэнты самі вылучаюць цэнтральныя тэмы наратыву, як то пачатак вайны, прыход нямецкай арміі і лёс ваеннапалонных на тэрыторыі Віцебшчыны. Разнастайнасць і варыятыўнасць вусных успамінаў адлюстроўвае як рэгіянальную спецыфіку сацыякультурнага ландшафту (Заходняя і Усходняя Беларусь), так і лакальныя асаблівасці ваеннай гісторыі рэгіёна. Успаміны “дзяцей вайны” – каштоўная гістарычная крыніца, якая не супрацьстаіць афіцыйнаму наратыву Вялікай Айчыннай вайны, але самім фактам свайго існавання заклікае да выпраўлення ідэалагічных штампаў і прафесійных фальсіфікацый, што дасталіся айчыннай гістарыяграфіі ў спадчыну яшчэ з савецкіх часоў.

ЛІТАРАТУРА

1. Фурсина, Н.О. Практика устной истории: детские воспоминания о Великой Отечественной войне / Н.О. Фурсина // Вестник Таганрогского института им. А.П. Чехова. – 2016. – № 1. – С. 280–286.
2. К’яры, Б. Штодзённасць за лініяй фронту: Акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941 – 1944 г.) / Б. К’яры ; пер. з ням. Л. Баршчэўскага ; нав. рэд. Г. Сагановіч. – Мінск, 2008. – 390 с.
3. Гудков, Л. «Память» о войне и массовая идентичность россиян / Л. Гудков // Память о войне 60 лет спустя: Россия, Германия, Европа. – М. : Новое литературное обозрение, 2005. – С. 83–103.
4. Мусял, Б. Савецкія партызаны ў 1941–1944 гг. Міфы і рэчаіснасць / Б. Мусял ; пер. з ням. У. Папковіча ; нав. рэд. У. Калаткоў. – Смаленск : Інбелкульт, 2018. – 592 с.

[30] ФА ПДУ: Зап. У. Аўсейчык у 2014 г. ад Раўковай Галіны Сідараўны, 1927 г.н. у в. Соржыца Бешанковіцкага р-на.

5. Я з вогненнай вёскі...: зб. успам. / склад. А. Адамовіч, Я. Брыль, У. Калеснік. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1983. – 437 с.
6. Детство войны 1941.1945 гг.: живые свидетельства Беларуси / Сост. Л.А. Александренко, К.И. Козак, Т.А. Кузьмичева. – Минск : И П Логвинов И.П., 2011. – 220 с.
7. Детство и война: культура повседневности, механизмы адаптации и практики выживания детей в условиях Великой Отечественной войны (на материалах Сталинградской битвы) / М.А. Рыблова [и др.] ; Южн. науч. ц-р РАН. – Волгоград : Изд-во Волгогр. фил. ФГБОУ ВО РАНХиГС, 2015. – 336 с.
8. Реброва, И.В. Мир детской повседневности в условиях оккупации Северного Кавказа / И.В. Реброва // Вестник Пермского университета. История. – 2014. – Вып. 2. – С. 80–89.
9. "За першымі саветамі" польска-беларускае памежжа 1939–1941 гг. у вусных успамінах жыхароў Беларусі / Уклад. В. Івановай ; пад рэд. А. Смаленчука. – Мінск : Зміцер Колас, 2019. – 376 с.
10. Великая Отечественная война в зеркале народной речи и фольклора: Тексты. Исследования. Аудиоприложение / Под общ. ред. Н. В. Большаковой ; Сост. Н. В. Большакова [и др.]. – Псков : ЛОГОС, 2016. – 332 с.
11. ЦАМО РФ. – Ф. 208. Оп. 2524. Д. 2. – Л. 8–12.
12. Lobach, U. German Soldiers in the Period of the Nazi Occupation in the Memories of the Belarusian Villagers / U. Lobach // Studia Białorutenistyczne. – 2019. – Vol. 13. – S. 72–89.
13. Комиссаров, В. Полоцкий укрепленный район (ПоУР). 1927–1941 гг. [Электронны рэсурс] / В. Комиссаров, С. Копыл, С. Поляков. – Рэжым доступу: http://kaponir.aroundspb.ru/4ur/04/pour/pour/pour.php. – Дата доступу: 30.05.2020.
14. Полацкі этнаграфічны зборнік / Уклад., прадм. і паказ. У.А. Лобача. – Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння. У 2 ч. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 2. – 368 с.

*Паступіў 11.06.2020*

## 1941 THROUGH THE EYES OF CHILDREN AND ADOLESCENTS OF THE VITEBSK REGION: AN ANTHROPOLOGICAL DISCOURSE OF MILITARY HISTORY

***U. LOBACH***

*The article discusses the features of children's perception of the initial stage of the Great Patriotic War and the Nazi occupation of Belarus in 1941. The key moments of childhood memories of the beginning of the war (retreat of the Red Army, the appearance of Wehrmacht soldiers, the fate of Soviet prisoners of war) are determined. The specific character of the perception and interpretation of historical events within the framework of local rural communities of Northern Belarus is characterized.*

***Keywords**: children, 1941, Vitebsk region, oral history, The Great Patriotic War.*